# ПРЫЁМЫ РАЗВІЦЦЯ ФАНЕМАТЫЧНАГА СЛЫХУ І ВЫМАЎЛЕНЧЫХ НАВЫКАЎ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ

Грыцук Ганна Аляксандраўна
УА “Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна”

Улічваючы, што ў аснове звязнай вуснай мовы ляжыць правільнае вымаўленне гукаў і іх спалучэнняў, прынцыпова важным з'яўляецца выпрацоўка ў вучняў артыкуляцыйных, акцэнталагічных, фанетыка-арфаэпічных уменняў. Авалодаць імі неабходна таксама і для фарміравання навыку чытання ўслых па-беларуску.

Несумненна, пачынаць выпрацоўку вымаўленчых навыкаў неабходна ўжо ў перыяд навучання грамаце, паколькі шасцігадовы ўзрост з’яўляецца асабліва прыдатным для авалодання фанетычным ладам роднай мовы. З гэтай прычыны настаўнік выкарыстоўвае заданні, накіраваныя на развіццё ў дзяцей маўленчага апарату, на пастаноўку артыкуляцыі гукаў, на развіццё фанематычнага слыху. Менавіта ад стану моўнага слыху дзяцей залежыць іх арфаграфічная і пунктуацыйная пісьменнасць, культура мовы. Вучань з развітым моўным слыхам чуйна ўспрымае разнастайныя інтанацыі, паўзы, змены ў тэмпе маўлення. Гэта ў сваю чаргу з’яўляецца ўмовай паспяховага засваення ім многіх правіл пунктуацыі. Такі вучань здольны пераймаць арфаэпічна правільную і інтанацыйна багатую мову дыктараў, артыстаў, настаўнікаў, свядома ставіцца да недахопаў уласнай мовы, пераадольваць іх. Школьнік са слаба развітым моўным слыхам, наадварот, наўрад ці навучыцца выразнаму чытанню. Такія вучні бездапаможныя і ў арфаграфічных адносінах.

Практыка навучання беларускай мове ў школах з рускай мовай выкладання паказвае, што слых дзяцей часта недастаткова тонка ўлоўлівае спецыфічныя артыкуляцыйныя рысы роднай мовы. Характэрныя асаблівасці беларускай артыкуляцыйнай базы часта памылкова лічацца вучнямі нязначным удакладненнем іх звычнай артыкуляцыі. Таму на ўроках трэба асабліва падкрэсліваць гэтыя адметныя асаблівасці, каб прыцягнуць да іх увагу дзяцей і дабіцца глыбокага практычнага засваення фанетыка-арфаэпічнага матэрыялу.

Паколькі прадметам назірання на ўроках фанетыкі з’яўляецца знешняя, гукавая абалонка слоў, то значнае месца на занятках павінны заняць вусныя практыкаванні. Найбольш эфектыўнымі для гэтых мэт з’яўляюцца такія метадычныя прыёмы, як апісанне артыкуляцыі, дэманстрацыя артыкуляцыйнага эталона, імітацыя артыкуляцыі ўслед за настаўнікам, чытанне скорагаворак, выкарыстанне аўдыязапісаў, саманазіранне пры артыкуляванні гукаў і інш.

Цікавымі ў сістэме працы па фанетыцы могуць стаць заданні на аналіз пачутага (прачытанага) выказвання па прапанаваным плане. Ён можа быць прыкладна наступным:

– пастаноўка голасу (мяккі, грудны, нізкі, не пісклявы, адрывісты, ціхі);

– дыкцыя (наколькі актыўна і правільна «працуюць» губы, язык);

– інтанацыя (зацікаўленая, перакананальная, невыразная, выразная, аднатонная, аднастайная);

– размеранасць маўлення (непаспешлівае, паспешлівае, словы пры вымаўленні не расцягваюцца, ёсць (няма) лішнія словы, і г. д.).

Адным з важных метадычных прыёмаў у методыцы выкладання фанетыкі з’яўляецца фанетычны разбор. Каб сфарміраваць свядомы і трывалы навык фанетычнага разбору, патрэбна сістэматычная праца, папярэднімі элементамі якой могуць быць «вусная пяцімінутка», «фанетычная зарадка», «фанетычная паўза», заданні тыпу: назваць у тэксце словы, дзе гукаў больш (менш), чым літар; назваць (падкрэсліць) літары, якія абазначаюць глухія зычныя гукі; назваць (падкрэсліць) літары – паказчыкі мяккасці зычных у словах і інш.

Прывядзём яшчэ некалькі практыкаванняў, якія спрыяюць засваенню фанетычных ведаў і фарміраванню вымаўленчых навыкаў малодшых школьнікаў.

– адрозненне гукаў ад літар: вызначыць, колькі гукаў і колькі літар у словах *лебедзь, дожджык, маладзець і інш.*; адказаць, якія гукі абазначаюць літары е, ё, ю, я ў словах *ёлка, есці, яблыня, абява;*

– падзел слова на склады; вымавіць словы па складах, запісаць словы, дзелячы іх рысачкай на склады;

– пастаноўка націску ў словах: вымавіць слова, выдзяляючы ў ім голасам націскны склад; пры спісванні паставіць націск у словах; запісаць словы пад дыктоўку, расстаўляючы ў іх націск; змяніць слова так, каб націск падаў на іншы склад (напрыклад, *зямля* - *землі*);

– групоўка слоў з пэўнымі гукамі: запісаць у адзін слупок словы на канцы з цвёрдым зычным, у другі – з мяккім і інш.

Як вядома, у мовазнаўстве гук разглядаюцца ў трох асноўных аспектах: фізіялагічным, акустычным, функцыянальным. У школьным курсе фанетыкі дадзеныя аспекты вывучэння гукаў не размежаваны: і ў тэарэтычнай частцы падручніка, і ў матэрыяле практыкаванняў гук дзеля зручнасці разглядаецца ў адзінстве сваіх уласцівасцей. У той жа час для самога настаўніка важна дакладнае ўсведамленне кожнага з гэтых аспектаў, каб, улічваючы іх асаблівасці, адбіраць тыя метады і прыемы, якія дадуць магчымасць найбольш паспяхова рашаць дыдактычныя задачы.